**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# КІСЛІК НАВУМ ЗІНОЎЕВІЧ (ЗАЛМАНАВІЧ)

**ПАЭТ, ПЕРАКЛАДЧЫК**

**26 ВЕРАСНЯ 1925 Г. – 27 СНЕЖНЯ 1998 Г.**

**ФОНД № 531**

**ВОПІС № 1**

**[1942–1944]–2001, коп. за 1939–1965 гг.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 531**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.З. КІСЛІКА | 1-53 | 1-8 |
| 1.1. | ЗБОРНІКІ ВЕРШАЎ, ВЕРШЫ Н.З. КІСЛІКА | 1-25 | 1-4 |
| 1.2. | ПЕРАКЛАДЫ Н.З. КІСЛІКА | 26-46 | 4-7 |
| 1.3. | РЭЦЭНЗІІ Н.З. КІСЛІКА І ІНШ. | 47-53 | 7-8 |
| 2. | ЛІСТАВАННЕ Н.З. КІСЛІКА | 54-73 | 8-10 |
| 2.1. | ЛІСТЫ Н.З. КІСЛІКА | 54-55 | 8 |
| 2.2. | ЛІСТЫ ДА Н.З. КІСЛІКА | 56-70 | 8-10 |
| 2.3. | ЛІСТЫ Н.З. КІСЛІКУ АД УСТАНОЎ | 71-73 | 10 |
| 3. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.З. КІСЛІКА, ДАКУМЕНТЫ ЯГО ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕНАЙСЦІ І ІНШ. | 74-81 | 10-11 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯЎ Н.З. КІСЛІКА | 82-87 | 11-12 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ Н.З. КІСЛІКА | 88-93 | 12-13 |
| 6. | ДАКУМЕНТЫ АБ УШАНАВАННІ ПАМЯЦІ Н.З. КІСЛІКА | 94-98 | 13 |
| 7 | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Н.З. КІСЛІКАМ ПА ЦІКАВЫХ ЯМУ ТЭМАХ, ФОТА Н.З. КІСЛІКА І ІНШ. | 99-107 | 13-15 |
| 8. | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Кіслік Навум Зіноўевіч (Залманавіч)** (псеўданімы К. Навумаў, Аўсей Аўсоў) нарадзіўся 26 верасня 1925 года ў Маскве, калі яго маці – хатняя гаспадыня Хая Нахімаўна Кіслік – гасцявала ў свайго старэйшага брата. Бацька – Залман Сіманавіч Кіслік – займаў пасаду старшыні Віцебскага кааператыўна-прамысловага аб’яднання “Аблкампрамсаюз”. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны разам з маці і малодшым братам (бацька ваяваў у складзе Чырвонай Арміі) эвакуіраваўся ў Набярэжныя Чалны (Татарская АССР), дзе працягнуў навучанне ў сярэдняй школе. Адначасова падпрацоўваў рознарабочым, страхаром на элеватары, лябёдка-аўтамабілістам. У 1942 годзе добраахвотнікам пайшоў на фронт: быў накіраваны на навучанне ў пераведзенае ў Сарапул (Удмуртская АССР) Смаленскае стралкова-пулямётнае вучылішча (цяпер – Смаленскае ваеннае пяхотнае вучылішча), адкуль – адпраўлены на фронт. Удзельнічаў у ваеннай аперацыі на Курска-Арлоўскай дузе, быў двойчы паранены. У 1944 годзе дэмабілізаваўся і прыехаў да дзеда ў Чкалаў (цяпер – Арэнбург), дзе ўжо знаходзіліся яго маці з братам. Каб падтрымаць сям’ю, уладкаваўся рабочым на станкабудаўнічы завод, пісаў карціны і прадаваў іх на мясцовым кірмашы. Паступіў у Чкалаўскі педагагічны інстытут (цяпер – Арэнбургскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт). У 1946 годзе пасля дэмабілізацыі бацькі ўся сям’я вярнулася ў Мінск, Н.З. Кіслік перавёўся на філалагічны факультэт БДУ. У 1950 годзе пасля сканчэння ўніверсітэта на 3 гады быў накіраваны настаўнікам беларускай і рускай мовы і літаратуры ў сярэднюю школу горада Дрыса (цяпер – Верхнядзьвінск)[1]. У 1952–1958 гадах – літсупрацоўнік газеты “Літаратура і мастацтва”, потым – часопіса “Полымя”. З 1959 года – на творчай рабоце.

Першыя вершы Н.З. Кіслік надрукаваў у 1944 годзе ў “Литературной газете” і газеце Паўднёва-Уральскай ваеннай акругі “Сталинец”. Аўтар зборнікаў вершаў: “Разговор с друзьями” (1956), “Поиск” (1959), “Зов земли” (1961), “Сказка о прессованном порохе” (1964), “Ветки” (1969), “Праздник снегопада” (1972), “Воспоминание о станциях” (1976), “Сентябрьская река” (1978), “Первоснежье” (1980), “Разные годы” (1984) і інш. Перакладаў з беларускай мовы на рускую: апавяданні А.Н. Карпюка “Данута” (1963), “Пущанская Одиссея” (1966) і яго кнігу прозы “По лесным тропам” (1964), раманы І.П. Мележа “Люди на болоте” (1964) і У.С. Караткевіча “Христос сошёл в Гродно” (1966), вершы Р.І. Барадуліна, П.У. Броўкі, А.С. Вялюгіна, С.С. Дзяргая, Я. Коласа, А.А. Куляшова, Я. Купалы, П.Е. Панчанкі, М.Л. Стральцова, М. Танка, Ю. Таўбіна і інш.

З 1954 года член Саюза пісьменнікаў СССР.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Н.З. Кіслік памёр 27 снежня 1998 года, пахаваны ў Мінску.

---

[1] Глядзі больш: В.З. Кислик “О красноармейце Науме Кислике, его друзьях и не только…” // “Мишпоха”, № 31 (анлайн: https://mishpoha.org/n31/31a14.php, доступ 03.09.2024).

Дакументы Н.З. Кісліка паступілі ў БДАМЛМ ад яго брата Валяр’яна Залманавіча Кісліка ў 2003 годзе. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 107 спраў (656 дакументаў) за [1942–1944]–2001, коп. за 1939–1965 гады.

Вопіс складаецца з 7 раздзелаў.

Першы раздзел складаюць творчыя дакументы Н.З. Кісліка: вершы і зборнікі вершаў, пераклады, рэцэнзіі і інш. Аўтарства некаторых перакладзеных Н.З. Кіслікам вершаў вызначана ўмоўна, паколькі арыгінальных вершаў у фондзе не засталося, а на саміх творах адсутнічае анатацыя. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе (зборнікі вершаў складзены па храналогіі, вершы – па алфавіце назваў) за [1942–1944]–2001 гады.

Другі раздзел прадстаўлены перапіскай Н.З. Кісліка з літаратарамі, перакладчыкамі і інш., пісьмамі Н.З. Кісліку ад устаноў. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па алфавіце краін, унутры краін – па алфавіце прозвішчаў адрасатаў/карэспандэнтаў, у пісьмах ад адной асобы – па храналогіі за 1949–1996 гады.

У трэцім раздзеле змешчаны асабістыя і службовыя дакументы Н.З. Кісліка, справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1946–1996 гады.

Чацвёрты раздзел складаюць дакументы да юбілеяў Н.З. Кісліка за 1975–1996 гады, пяты раздзел – дакументы пра і са згадкай Н.З. Кісліка за 1972–1991 гады, шосты раздзел – дакументы аб ушанаванні памяці Н.З. Кісліка за 1999–2001 гады. Справы ў раздзелах сістэматызаваны па відах.

У сёмым раздзеле змешчаны дакументы, сабраныя Н.З. Кіслікам па цікавых яму тэмах, фота Н.З. Кісліка і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1962–2001, коп. за 1939–1965 гады.

Прадмову склала
Загадчык аддзела В.Ф. Шаталава
03.09.2024

Установа “Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва”

ФОНД № 531
ВОПІС № 1
[1942-1944]-2001, коп. за 1939-1965

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 27.09.2024
№ 8

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| | **1.1. ЗБОРНІКІ ВЕРШАЎ, ВЕРШЫ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| 1 | Н.З. Кислик. "Верстовая полоса". Вершы да мяркуемага зборніка "с вкраплениями из других книг".<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай.<br>На Л. 1 - заўвага да рукапісу В.З. Кісліка (брата) (аўтограф) (2000) | [1985] | 167 | 1 | |
| 2 | Н.З. Кислик. "Зимний свет". Вершы да мяркуемага зборніка. Няпоўны тэкст. Без вокладкі.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай.<br>На Л. 1 - заўвага да рукапісу В.З. Кісліка (брата) (аўтограф) (2000 | 1985 | 18 | 1 | |
| 3 | Н.З. Кислик. "Лестница лет". Вершы і паэма да мяркуемага зборніка. Няпоўны тэкст. Без вокладкі.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай карэктурай | 1985 | 79 | 1 | |
| 4 | Н.З. Кислик. "Календари бессонно шелестят". Вершы да мяркуемага зборніка "с вкраплениями из некоторых других книг - началами и концовками стихов". Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай і дапіскамі.<br>На Л. 1 - заўвага да рукапісу В.З. Кісліка (брата) (аўтограф) (2000) | 1987 | 71 | 1 | |
| 5 | Н.З. Кислик. "Памяти патефона". Вершы да мяркуемага зборніка.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай.<br>На Л. 1 - заўвага В.З. Кісліка (брата) адносна гэтага зборніка (2000) | 1994 | 219 | 1 | |
| 6 | Н.З. Кислик. "Памяти патефона". Зборнік вершаў. Няпоўны тэкст. Без вокладкі.<br>Вёрстка з карэктурай.<br>На Л. 1 - заўвага В.З. Кісліка (брата) адносна гэтага зборніка (2000) | 1994 | 59 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Вершы Н.З. Кісліка | | | | |
| 7 | Н.З. Кислик "Степь", "Штурм" і інш. Вершы. Фрагменты [насценгазет], "Литературная газета" за 7 лістапада 1944 года | [1942-1944] - 1944 | 5 | 3 | |
| 8 | Н.З. Кислик "Дот", "Из лирики", "Мое поколение", "Не сметь!" і інш. Вершы. Выразкі і ксеракопія з друкаваных і перыядычных выданняў | 1946 - [да 1998 г.] | 38 | 34 | |
| | *** | | | | |
| 9 | Н.З. Кислик "А в жизни не всегда поют красиво…", "А душа, конечно же, нетленна…", "А на сердце камень…", "А осень по жар-птицам, по иллюзиям…" і інш. Вершы за 1948-1985 гады (у т.л. варыянты тэкстаў). Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | 53 | 33 | |
| 10 | Н.З. Кислик "Выпустить птицу…", "Выросли, преодолели трудности…", "Глина", "Городу, чтоб стать Парижем…" і інш. Вершы за 1964-1987 гады (у т.л. варыянты тэкстаў). Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | 48 | 33 | |
| 11 | Н.З. Кислик "К проекту разоружения", "Казалось бы, мы глаз людских…", "Как сыр в масле", "Какое ранее время…" і інш. Вершы за 1958-1985 гады (у т.л. варыянты тэкстаў). Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | 51 | 33 | |
| 12 | Н.З. Кислик "Нелетная погода и непевчая…", "Неожиданно зуммер затих…", "Новогоднее-84"="Новогоднее для друзей", "Ночь Победы" і інш. Вершы за 1968-1984 гады (у т.л. варыянты тэкстаў). Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | 53 | 33 | |
| 13 | Н.З. Кислик "Подмастерье", "Полемисты", "Последняя корректура", "Посредине войны", "Праздник снегопада" і інш. Вершы за 1982-1994 гады (у т.л. варыянты тэкстаў). Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | 53 | 32 | |
| 14 | Н.З. Кислик "Собеседник", "Создай!", "Сон о гильзах"="Сон о стреляных гильзах", "Сон снега" і інш. Вершы за 1950-1980 гады (у т.л. варыянты | | 54 | 28 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | тэкстаў).<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | | | |
| | Нататнікі і сшыткі з вершамі Н.З. Кісліка | | | | |
| 15 | Нататнік з вершамі Н.З. Кісліка "Вначале было слово, а ещё…", "Как только я усвоил, что причина…", "Не потому, что редки стали…" і інш.<br>Чарнавы аўтограф.<br>На Л.1 - заўвага В.З. Кісліка (брата) адносна даціроўкі гэтага нататніка (2000) | [1965] | 55 | 1 | |
| 16 | Нататнік з вершамі Н.З. Кісліка "Боже мой! Когда б ты был на свете…", "Вода отталкивала берег…", "И - обетованная земля…" і інш. Без вокладкі.<br>Чарнавы аўтограф | [1960-я - 1970-я гг.] | 24 | 1 | |
| 17 | Нататнік з вершамі Н.З. Кісліка "Больничный дворик", "Памяти окраины", "Что-то стали слышны поезда" і інш.<br>Аўтограф | [1970-я гг.] | 86 | 1 | |
| 18 | Агульны сшытак з вершамі і фрагментамі вершаў Н.З. Кісліка "Маятник мается…", "От шумных центров вдалеке…", "Туман, туман, густой и беловатый…" і інш.<br>Чарнавы аўтограф | [1970-я - 1980-я гг.] | 58 | 1 | |
| 19 | Нататнік з вершамі Н.З. Кісліка "В моей груди застрял свинец…", "Всё ещё держатся холода…", "Страницы Ветхого Завета…" і інш., яго "Рассказом Т. о её матери" і інш.<br>Чарнавы аўтограф | [1980-я гг.] | 15 | 1 | |
| 20 | Нататнікі з вершамі Н.З. Кісліка  "Ищу на картах…", "Не пускали меня заграницу…", "Сомнение" і інш. запісамі.<br>Чарнавы аўтограф | [ад 1990 г.], [1995] | 45 | 2 | |
| 21 | Нататнік з вершамі Н.З. Кісліка "Бывали дни…", "Над усталой памятью войны...", "Лош[адиный] тост" і інш.<br>Чарнавы аўтограф | [ад 1993 г.] | 26 | 1 | |
| 22 | Агульны сшытак з вершамі Н.З. Кісліка "Ищу на карте…", "Написал записку…", "Проснулася, лоб свободой осеня…", "Скоро буду" і інш., зместам мяркуемых зборнікаў вершаў "Избранное" і "Шелест календарных листьев" і інш. | [1995] | 35 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Чарнавы аўтограф | | | | |
| | *** | | | | |
| 23 | Н.З. Кислик "Фантомная боль. Из неопубликованного". Падборка вершаў для часопіса "Нёман", укладзеная В.З. Кіслікам (братам). Чарнавы аўтограф Н.З. Кісліка, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс, выразка з часопіса | [пасля 1998 г.] | 41 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 24 | Фрагменты вершаў (у т.л. з заўвагамі і праўкай Н.З. Кісліка) і інш. за 1956-1994 гады. Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | 91 | 1 | |
| 25 | Спісы твораў Н.З. Кісліка, зместы (рабочыя) да зборнікаў яго вершаў і інш. Чарнавы аўтограф, машынапіс | [1983-1995] | 33 | 20 | |
| | **1.2. ПЕРАКЛАДЫ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| | Пераклад рамана У.С. Караткевіча | | | | |
| 26 | В. Короткевич. "Христос приземлился в Городне". Раман у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. 1 варыянт тэксту. Пачатак. Без тытульнай старонкі. Машынапіс з праўкай перакладчыка і ўстаўкамі | 1965-1966 | 197 | 1 | |
| 27 | В. Короткевич. "Христос приземлился в Городне". Раман у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. 1 варыянт тэксту. Працяг. Машынапіс з праўкай перакладчыка | 1965-1966 | 203 | - | |
| 28 | В. Короткевич. "Христос приземлился в Городне". Раман у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. 1 варыянт тэксту. Заканчэнне. Машынапіс з праўкай перакладчыка | 1965-1966 | 195 | - | |
| | *** | | | | |
| 29 | В. Короткевич. "Христос приземлился в Городне". Раман у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. 2 варыянт тэксту. Пачатак. Машынапіс з праўкай перакладчыка | 1965-1966 | 174 | 1 | |
| 30 | В. Короткевич. "Христос приземлился в Городне". Раман у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы | 1965-1966 | 176 | - | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | на рускую. 2 варыянт тэксту. Працяг. Машынапіс з праўкай перакладчыка | | | | |
| 31 | В. Короткевич. "Христос приземлился в Городне". Раман у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. 2 варыянт тэксту. Заканчэнне. Машынапіс з праўкай перакладчыка | 1965-1966 | 178 | - | |
| | Пераклады вершаў, зробленыя Н.З. Кіслікам, і інш. | | | | |
| 32 | Н. Вълчев "Судьбы еврейские", "Цыганское гадание". Вершы ў перакладзе Н.З. Кісліка з балгарскай мовы на рускую. Чарнавы аўтограф перакладчыка паверх машынапіснага тэксту верша па-балгарску, чарнавы аўтограф перакладчыка, машынапіс з праўкай перакладчыка, машынапіс | [1980-я гг.] | 10 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 33 | Р. Бородулин "Веду разговор з Доминикою…", "Выпустить птицу…", "За какими заморьями…", "Знаки препинания…" і інш. Вершы ў перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Чарнавы аўтограф, аўтограф [Р.І. Барадуліна з пачаткам падрадковага перакладу Н.З. Кісліка], машынапіс з праўкай перакладчыка, машынапіс, выразкі з газеты і часопіса | [1980-я - 1990-я гг.] - 1993 | 37 | 25 | |
| 34 | Я. Колас "Дубы". Верш у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Чарнавы аўтограф перакладчыка паверх машынапіснага тэксту верша па-беларуску, машынапіс | [1970-я - 1980-я гг.] | 4 | 1 | |
| 35 | В. Короткевич "Был. Ёсць. Буду", "Книги", "Хоть безоружна, но сердечна…". Вершы ў перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Чарнавы аўтограф перакладчыка, машынапіс з нязначнай праўкай перакладчыка | 1998 | 9 | 3 | |
| 36 | А. Кулешов "Слово неизвестного солдата". Верш у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Машынапіс | [1980 гг.] | 3 | 1 | |
| 37 | Я. Купала "Белорусские сыны", "Великдень", "Из минувших дней…", "Хватит" інш. Вершы ў перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. | [1970-я - 1980 гг.] - 2001 | 21 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Чарнавы аўтограф перакладчыка паверх машынапіснага тэкста вершаў па-беларуску, машынапіс, выразка з часопіса | | | | |
| 38 | П. Панченко "За океаном". Верш у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Выразка з часопіса "Огонёк" | 1960 | 1 | 1 | |
| 39 | Я. Пушча "Начало легенды". Верш у перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на русскую. Чарнавы аўтограф перакладчыка | [пасля 1960 г.] | 1 | 1 | |
| 40 | А. Пысин "На железном костре самолёта…", "На дубах соловьи отсвистали…", "Отстал в походе…"; неўстаноўлены аўтар "Салют сорок пятого". Вершы ў перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на русскую. Выразкі з газет | 1967, 1977 | 2 | 2/4 | |
| 41 | М. Танк "Amicus Plato", "Беларуси", "Бойцу белорусского фронта", "Бродяги", "Бывает порою…" і інш. Падборка вершаў да мяркуемага зборніка ў перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Няпоўны тэкст. Аўтограф перакладчыка, машынапіс з праўкай перакладчыка, машынапіс | [да 1998 г.] | 105 | 1 | |
| 42 | М. Юдовин "В моей душе - струна для вас…", "Память", "Сон". Вершы ў перакладзе Н.З. Кісліка з беларускай мовы на рускую. Чарнавы аўтограф перакладчыка, машынапіс | [1980-я - 1990-я гг.] | 5 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 43 | Неўстаноўлены/я аўтар/ы "Араратская долина", "За какими заморьями…", "Звёздочка моя" і інш. Вершы [ў перакладзе Н.З. Кісліка на рускую мову]. [Чарнавы аўтограф перакладчыка, аўтограф перакладчыка], машынапіс | [1970-я - 1990-я гг.] | 35 | 33 | |
| | Пераклады вершаў Н.З. Кісліка | | | | |
| 44 | Н. Кислик "Душата" ("Итак, признаем факт без куража..."), "Летене насън" ("Не пускали меня за границу..."). Вершы ў перакладзе Н. Вълчева з рускай мовы на балгарскую. Машынапіс | [1980-я - 1990-я гг.] | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 45 | Н. Кіслік "Журавы", "Махорка", "Мядовыя коржыкі", "Упартая песня" і інш. Вершы ў перакладзе Р.І. Барадуліна з рускай мовы на беларускую. Выразкі з часопіса "Полымя" (з праўкай) і газет | 1959-1960 | 8 | 3/5 | |
| | *** | | | | |
| 46 | נ. קיסליק (Н. Кіслік) "פענע לידעלעכ די געגליבט..." ["Вельмі спадабалася прыгожае пяро…"], "כאלוימעם פויגלשע" ["Птушыны арэол"]. Вершы ў перакладзе Гірша Рэлеса з рускай мовы на ідыш. Газета "Биробиджанер Штерн. ביראָבידזשאנער שטערן" за 3 і 10 кастрычніка 1992 года | | 8 | 2 | |
| | **1.3. РЭЦЭНЗІІ Н.З. КІСЛІКА І ІНШ.** | | | | |
| 47 | Рэцэнзіі Н.З. Кісліка на зборнікі вершаў Р.І. Барадуліна "Неруш", С.С. Дзяргая "Чатыры стыхіі", Я.А. Хялемскага "Ключ" і інш. Выразкі з газет | 1963-1972 | 4 | 4 | |
| 48 | Рэцэнзіі і інш. Н.З. Кісліка на рукапісы зборнікаў вершаў В.М. Айзенштадта "И день, и ночь", М. Калачынскага "Заповедь верности", І. Катлярова "Друзья мои - свидетели" (у суаўтарстве з А.А. Дракахрустам і В.Я. Тарасам) і інш. Чарнавы аўтограф, аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | 1978-[1987] | 45 | 8 | |
| | *** | | | | |
| 49 | Н.З. Кіслік "Што можна зразумець пры дапамозе чытання". Рэпліка на публікацыю П. Макарэвіча ў газеце "ЛіМ". Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1983 | 3 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 50 | Агульны сшытак з запісамі Н.З. Кісліка (лекцый па дыялекталогіі, сінтаксісу і інш.), вершамі Н.З. Кісліка сябрам і інш. Чарнавы аўтограф. На Лл. 2, 17 - накіды мужчынскіх партрэтаў і інш. (туш) | [да сяр. 1950 г.] | 29 | 1 | |
| 51 | Нататнік з выпісанымі Н.З. Кіслікам па алфавіту словамі (руская мова). Аўтограф | [ад 1965 г.] | 54 | 1 | |
| 52 | Нататнік з запісамі аб пазычаных у Н.З. Кісліка кнігах. | [1970-я гг.] | 13 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Аўтограф.<br>На Л. 13 - накіды шаржаў на неўстаноўленых асоб (шарыкавая ручка) | | | | |
| | *** | | | | |
| 53 | Спіс дакументаў Н.З. Кісліка, перададзеных яго братам у БДАМЛМ.<br>Машынапіс | 2000 | 1 | 1 | |
| | **2. ЛІСТАВАННЕ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| | **2.1. ЛІСТЫ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| 54 | Лісты Н.З. Кісліка Б. Ахмадулінай, [К.Я. Ваншэнкіну] (2) і В.А. Элькіну (2) (Масква) і са зваротамі "Уважаемый Валерий Дмитриевич!", "Уважаемый Геннадий Борисович!" і інш. па творчых пытаннях.<br>Чарнавікі | 1973-1984 | 19 | 9 | |
| | *** | | | | |
| 55 | Лісты Н.З. Кісліка галоўнаму рэдактару выдавецтва "Советский писатель" П.А. Кошалю (Масква) наконт магчымага перавыдання зборніка "Беларусь в огне" і ў неўстаноўленыя ўстановы з просьбай дапамагчы выдаць зборнік вершаў В.М. Айзенштадта.<br>Чарнавікі | [1970-я - 1980-я гг.] | 5 | 3 | |
| | **2.2. ЛІСТЫ ДА Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| | БССР | | | | |
| 56 | Лісты, паштоўка і тэлеграма ад Э. Агняцвет, Р.І. Барадуліна (2) (з Уладзівастока), П.У. Броўкі (Мінск), В.У. Быкава (4) (Гродна) да Н.З. Кісліка.<br>Да ліста В.У. Быкава прыкладзены запрашальны білет на сяброўскую вячэру на імя Н.З. Кісліка (1984) - Л. 12 | 1965-1980 | 12 | 9 | |
| 57 | Лісты і тэлеграма ад Л. Вакулоўскай (3) (Мінск), В.А. Варно (Мінск), З.С. Гаўрусёва (Мінск), У.С. Караткевіча (Рагачоў) і інш. да Н.З. Кісліка | 1966-1985 | 12 | 7 | |
| 58 | Лісты і паштоўкі ад А.А. Куляшова (Мінск), П.Е. Панчанкі (3) (Мінск), А.В. Пысіна (3) (Магілёў) да Н.З. Кісліка | 1965-1982 | 8 | 7 | |
| | Грузінская ССР | | | | |
| 59 | Ліст і паштоўка ад Э.А. Фэйгіна (Тбілісі) да Н.З. Кісліка | 1984 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Казахская ССР | | | | |
| 60 | Лісты ад Р.М. Тамарынай (Алма-Аты) да Н.З. Кісліка | 1982 | 7 | 2 | |
| | Латвійская ССР | | | | |
| 61 | Паштоўка Р.Р. Дабровенскага (Р.Г. Добровенский) (Рыга) да Н.З. Кісліка | 1978 | 1 | 1 | |
| | РСФСР, Расія | | | | |
| 62 | Лісты А.М. Адамовіча (Масква) да Н.З. Кісліка | 1962-[1967] | 8 | 8 | |
| 63 | Лісты і тэлеграмы С.І. Аліханова (Масква), Б.А. Ахмадулінай (2) (Масква), К.Я. Ваншэнкіна (7) (Масква) да Н.З. Кісліка | 1977-1986 | 13 | 10 | |
| 64 | Лісты і паштоўка ад Я.М. Вінакурава (Е.М. Винокуров) (Масква), М.Р. Грачова (М.Г. Грачёв) (Іванава), С.Д. Давыдава (3) (Ленінград, Дубулты), Э.У. Кардзіна (Э.В. Кардин) (Масква) (5) да Н.З. Кісліка | [1977]-1985 | 11 | 10 | |
| 65 | Лісты і запіска ад Р.А. Корына (Хімкі) (2), Л.І. Лазарава (Л.И. Лазарев) (3) (Масква), С.Б. Ласкіна (3) (Ленінград), Ю.Д. Левітанскага (Масква), М.С. Лісянскага (Масква), А.П. Межырава (2) (Перадзелкіна) да Н.З. Кісліка.<br>Да ліста А.П. Межырава прыкладзена рукапісная копія верша В.М. Айзенштадта "Я мертвых за разлуку не корю…" - Л. 12 | [1979]-1996 | 13 | 12 | |
| 66 | Лісты і паштоўкі ад Я.А. Хялемскага (Я.А. Хелемский) (9) (Масква), Ю.Д. Чарнічэнкі (Масква), В.А. Элькіна (Масква) да Н.З. Кісліка | [1979]-1986 | 16 | 11 | |
| | Узбекская ССР | | | | |
| 67 | Ліст ад С.Г. Яўсеевай (С.Г. Евсеева) (Ташкент) да Н.З. Кісліка | 1984 | 2 | 1 | |
| | УССР | | | | |
| 68 | Лісты ад Р.С. Глазава (Г.С. Глазов) (Львоў), У.М. Хіжняка (В.М. Хижняк) (Кіеў) да Н.З. Кісліка | 1980 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 69 | Лісты ад неўстаноўленых літаратараў [і інш.] да | 1976-1987 | 10 | 9 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Н.З. Кісліка | | | | |
| | *** | | | | |
| 70 | Лісты, паштоўка і тэлеграма В.З. Кісліка (брата), сяброў і знаемых да Н.З. Кісліка | 1949-1985 | 17 | 11 | |
| | **2.3. ЛІСТЫ Н.З. КІСЛІКУ АД УСТАНОЎ** | | | | |
| 71 | Лісты ад часопісаў "Дружба народов" (3) і "Литературное обозрение" (Масква), літаратурнага аб'яднання "Никитинские субботники" (Масква) і інш. Н.З. Кісліку з просьбай прысляць яго кнігі з аўтографамі і інш. | 1964-1985 | 6 | 6 | |
| 72 | Лісты ад часопісаў "Даугава" (Рыга), "Дружба народов", "Знамя", "Литературное обозрение" і "Юность" (Масква) і выдавецтваў "Советский писатель" і "Художественная литература" (2) (Масква) Н.З. Кісліку па пытанні друку яго вершаў і перакладаў | 1966-1980 | 8 | 8 | |
| | *** | | | | |
| 73 | Ліст генерал-маёра Я.І. Драйчука - стваральніка Ржаўскай вясковай бібліятэкі (Магілёўская вобласць) да Н.З. Кісліка з просьбай падпісаць для бібліятэкі зборнік яго вершаў | 1966 | 1 | 1 | |
| | **3. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.З. КІСЛІКА, ДАКУМЕНТЫ ЯГО ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕНАЙСЦІ І ІНШ.** | | | | |
| 74 | Ордэнскія кніжкі да ордэнаў "Отечественной войны" I і II ступеняў на імя Н.З. Кісліка.<br>Пасведчанні да медалёў "Ветеран труда", "За Победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг." і інш. на імя Н.З. Кісліка | 1946-1995 | 14 | 11 | |
| 75 | Сяброўскі білет Літаратурнага фонду СССР (з запісамі за 1957-1974 гады), пропуск ў паліклініку Беллітфонду і інш. на імя Н.З. Кісліка | 1957-1991 | 13 | 4 | |
| 76 | Запрашальны білет на творчы вечар Н.З. Кісліка.<br>Запрашэнне дырэктароў выдавецтваў "Мастацкая літаратура" і "Юнацтва" свайму аўтару - Н.З. Кісліку - на сустрэчу з чытачамі ў межах Кніжнай выставы, прысвечанай 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.<br>На адвароце Л. 3 - накід верша Н.З. Кісліка "У меня на полу..." (чарнавы аўтограф) [1994] | 1985, 1994 | 3 | 2 | |
| 77 | Памятка "Участнику юбилейной встречи поколений" | 1986 | 5 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | і праграма сустрэчы выпускнікоў сярэдняй школы № 1 імя Г. Дзімітрава горада Брэжнеў (Татарская АССР) з нагоды 50-годдзя школы (Н.З. Кіслік - выпускнік) | | | | |
| | *** | | | | |
| 78 | Загад галоўнага рэдакатара газеты "ЛіМ" М.Г. Ткачова аб звальненні Н.З. Кісліка. Рукапісная копія. Пратакол № 1 пасяджэння камісіі па працоўных спрэчках Мясцовага камітэта прафсаюза пры Саюзе пісьменнікаў БССР аб аднаўленні Н.З. Кісліка на працы ў газеце "ЛіМ" | 1958 | 3 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 79 | Заява Н.З. Кісліка дырэктару выдавецтва "Советский писатель" з просьбай уключыць у выдавецкі план зборнік яго вершаў "Верстовая полоса" | 1986 | 1 | 1 | |
| 80 | Рэкамендацыя Н.З. Кісліка паэту В. Айзенштадту (Блажэнных) аб прыёме ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Аўтарызаваны машынапіс | 1992 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 81 | Запавет Н.З. Кісліка. Няпоўны тэкст. Машынапіс | 1996 | 1 | 1 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯЎ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| 82 | Віншавальны адрас беларускіх літаратараў Н.З. Кісліку з 50-годдзем з дня нараджэння з аўтографамі В.У. Адамчыка, Л.Л. Арабей, Я. Брыля, А.А. Дракахруста, В.В. Зуёнка, У.С. Караткевіча, П.С. Васілеўскага, П.М. Макаля, А.А. Слесарэнкі і інш. | 1975 | 2 | 1 | |
| 83 | Віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы ад Э. Агняцвет, В.А. Бечыка, Я. Брыля, В.У. Быкава, А.А. Куляшова, П.Е. Панчанкі і інш. (БССР) Н.З. Кісліку з 50- і/ці 60-годдзем з дня нараджэння | 1975-1985 | 15 | 9 | |
| 84 | Віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы ад В.Д. Асоцкага, А.А. Вазнясенскага, К.Я. Ваншэнкіна, Я.А. Казлоўскага, Я.А. Хялемскага, І.І.Шклярэўскага і інш. (РСФСР) Н.З. Кісліку з 50- ці 60-годдзем з дня нараджэння | 1975-1985 | 12 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 85 | Віншавальныя тэлеграмы ад сваякоў і знаёмых Н.З. Кісліку з 50-годдзем з дня яго нараджэння (БССР, РСФСР) | 1975 | 8 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 86 | Віншавальныя тэлеграмы ад рэдакцыі часопіса "Беларусь", навучэнцаў Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча і праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Н.З. Кісліку з 50-годдзем з дня нараджэння | 1975 | 5 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 87 | Р. Барадулін. "…Прысуджаны да найвышэйшай меры". Артыкул да 70-годдзя з дня нараджэння Н.З. Кісліка.<br>Выразка з газеты | 1995 | 1 | 1 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| 88 | М.Г. Грачёв. "Хлеба хочется снова…". Верш-прысвячэнне Н.З. Кісліку ад 10 траўня 1977 года.<br>Аўтограф | | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 89 | Прадмовы К.Я. Ваншэнкіна і Я.А. Хялемскага да зборніка вершаў Н.З. Кісліка "Лестница лет" і інш. Фрагмент літаратуразнаўчага [артыкула Я.А. Хялемскага] са згадкай Н.З. Кісліка і яго верша "Чертеж прорыва".<br>Аўтарызаваныя машынапісы, выразка і ксеракопія з друкаваных выданняў | [ад 1978 г. - да кан. 1998 г.] | 8 | 3 | |
| 90 | Заключэнне і рэцэнзіі Д. Галубкова, Д. Гальмакова, Л.В. Дранько-Майсюка і інш. на зборнікі вершаў Н.З. Кісліка "Воспоминания о вокзалах", "Сентябрьская река" і інш.<br>Аўтарызаваныя машынапісы з нязначнай праўкай, аўтарызаваны машынапіс, вёрстка з карэктурай | 1972-1991 | 14 | 5 | |
| 91 | Рэцэнзіі П.У. Броўкі, А.К. Клышкі, Р. Салаўева і неўстаноўленага аўтара на пераклады Н.З. Кіслікам зборнікаў вершаў Р.І. Барадуліна "Наопрокидь", Я. Купалы "Избранные стихотворения и поэмы" і А. Русецкага "Служба света".<br>Аўтарызаваныя машынапісы, машынапіс з нязначнай праўкай, машынапіс | 1977-[1982] | 18 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 92 | Адказы Н.З. Кісліка на пытанні арганізатараў "Дня паэзіі".<br>Машынапіс | 1975 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 93 | Ліст А.Т. Твардоўскага да А.А. Куляшова і Б.А. Слуцкага за зваротам да "Софьи Григорьевны" са згадкай Н.З. Кісліка.<br>Арыгінал і фотакопія | 1969, [да 1986 г.] | 2 | 2 | |
| | **6. ДАКУМЕНТЫ АБ УШАНАВАННІ ПАМЯЦІ Н.З. КІСЛІКА** | | | | |
| 94 | Некралогі, словы на смерць Н.З. Кісліка і інш.<br>Выразкі з газеты | 1999-2000 | 6 | 6/7 | |
| 95 | Лісты Э.У. Кардзіна (Масква) са зваротам "Дорогой Саша!", Я.А. Хялемскага (Масква) і за подпісам "Твой Саша" да В.З. Кісліка (брата) з нагоды смерці Н.З. Кісліка | 1999-2001 | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 96 | А. Дракохруст. "Тебе - жить!". Цыкл вершаў памяці Н.З. Кісліка.<br>Машынапіс | 1999 | 5 | 1/9 | |
| 97 | А. Рабкин. "Между сердцем и памятью"="Поминки". Журботны эцюд на смерць Н.З. Кісліка з паясненнем, адрасаваным Р.І. Барадуліну.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 2001 | 17 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 98 | Калектыўны зварот Р.І. Барадуліна, А.А. Дракахруста, В.З. Кісліка і інш. да кіраўніцтва арганізацыі "Джойнт" у Беларусі з просьбай фінансава падтрымаць выданне пасмяротнага збору вершаў Н.З. Кісліка.<br>Машынапіс | 1999 | 2 | 1 | |
| | **7 ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Н.З. КІСЛІКАМ ПА ЦІКАВЫХ ЯМУ ТЭМАХ, ФОТА Н.З. КІСЛІКА І ІНШ.** | | | | |
| 99 | А. Ахматова "Реквием", Р. Барадулін "Рыгор Бярозкін", И. Бродский "Большая элегия Джону Донну", Е. Евтушенко "Памяти Есенина" і інш. Вершы.<br>[Аўтограф Р.І. Барадуліна], машынапісныя копіі | 1991, коп. за 1958-1965 | 25 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 100 | Рэцэнзіі В.А. Бечыка на зборнік вершаў Ю.А. Лакербая "Рэха родных гор" (Мінск, 1962) і І. Фалькова на зборнік вершаў І.І. Шклярэўскага "Стихотворения" (Масква, 1997).<br>Выразкі з газет | 1962, 1998 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 101 | А. Матышев "Уроки вождя", Ю. Щекочихин "Вспомнить и не забывать" і інш. Артыкулы і нататка.<br>Ф. Раскольников "Открытое письмо Сталину" (машынапісная копія з газеты "Новая Россия" (№ 71, 1939).<br>Фрагменты газет "Европейское время" (№ 4, 1992) і "Литератор" (№ 23, 1990), выразка з газеты, машынапісная копія | 1988-1992, коп. за 1939 | 14 | 4 | |
| 102 | Ліст А.І. Салжаніцына IV з'езду Саюза савецкіх пісьменнікаў ад 16 траўня 1967 года (машынапісная копія).<br>"Литературная газета" (№ 21, 1967), прысвечаная IV з'езду Саюза савецкіх пісьменнікаў (без некаторых старонак) | | 7 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 103 | Артыкулы і нататкі, прысвечаныя працэсу над нацысцкім злачынцам Адольфам Эйхманам (на польскай мове).<br>Выразкі з газет | 1961 | 55 | 54 | |
| 104 | Газета "Авив. אביב. Вясна" (№ 9 за 1992 год і № 6 за 1993 год (без некаторых старонак), №№ 3 і 4 за 1997 год) з публікацыямі пра Мінскае гета, забойства Саламона Міхоэлса і інш.<br>Газета "Биробиджанер Штерн. ביראָבידזשאנער שטערן" за 23 кастрычніка 1992 года (на ідыш і рускай мове) (фрагмент) | | 24 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 105 | Фотаздымкі Н.З. Кісліка, індывідуальныя | 1968 - [1980-я гг.] | 6 | 6 | |
| 106 | Фотаздымак А.Т. Твардоўскага на хутары Загор'е ў верасні 1943 года.<br>Аўтар - В.І. Аркашоў.<br>Копія | | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 107 | Дакументы З.С. Кісліка (бацькі): аўтабіяграфія (аўтограф) і асабісты лісток па ўліку кадраў, запоўнены З.С. Кіслікам | 1961 | 4 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 107 (сто сем)

спраў з № 1 па № 107 , 656 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

заг. аддзела ________________ В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў ________________ В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.